А на конкурсе “Еўрабачанне” ўпершыню прагучала песня на беларускай мове. Прадстаўляла нашу краіну група “Naviband” з песняй “Гісторыя майго жыцця”. І хай нашы ўдзельнікі не сталі пераможцамі, але гэта яшчэ адна магчымасць заявіць на ўвесь свет, што мы беларусы, што мова наша жывая і будзе жыць.

На нашу думку, напрамкамі працы па папулярызацыі беларускай мовы могуць быць наступныя:

- ✓ слухай і глядзі беларускае;
- ✓ шануй беларускую мову і патрабуй належных адносінаў ад сучаснікаў;
- ✓ дзяліся тым беларускім, што маеш сам;
- ✓ кантактуй, пішы па-беларуску;
- ✓ падтрымлівай і заахвочвай любыя праяўленні зацікаўленасці беларускай мовай з боку іншых.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што беларуская мова сёння даволі запатрабавальная у нашай краіне, і ў дзяржаве робяцца пэўныя намаганні для яе адраджэння і падтрымкі.

ЛІТАРАТУРА:

1. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=2111. – Дата доступа: 27.10.2018. 2. Будзьма беларусамі [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: http://budzma.by/news/makyey-u-krainye-stvarayucca-narmalnyya-wmovy-dlya-bolsh-shyrokaha-vykarystannya-byelaruskay-movy.html. – Дата доступу: 27.10.2018.
3. Белсат [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belsat.eu/news/tsyaper-i-makdonalds-na-move-belarusy-u-zahaplenni-ad-mashtabnaj-belarusizatsyi/. – Дата доступа: 27.10.2018.

## НОВЫЯ СЛОВЫ Ў ЛЕКСІЦЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Сяліцкі У.С., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

*Актуальнасць даследавання.* Лексіка беларускай мовы ўключае сотні тысяч слоў, розных і па часе ўзнікнення, і па паходжанні, і па стылістычнай афарбоўцы, і паводле ўжывання. Менавіта праз словы нашай роднай мовы адлюстроўваюцца ўсе змены ў грамадска-палітычным, эканамічным, духоўным жыцці людзей. Таму літаратурная мова, асабліва яе слоўнікавы склад, знаходзяцца ў няспынным абнаўленні і развіцці, звязаным з жыццём грамадства. Гэтыя змены ў лексічным складзе мовы час ад часу адлюстроўваюцца ў чарговых выданнях ці ў дапоўненых перавыданнях тлумачальных слоўнікаў.



Рэпазіторый ГрГМУ

Бартэр (тавараабмен); вернік (веруючы чалавек); кансэнсус (шлях прыняцця агульнай згоды); рэйтынг (паказчык значнасці); святар (царкоўны служка); спадар (гаспадар) і інш.

Зыходзячы з вышэй сказанага, сфармулявана праблема:

недастатковая даследаванасць спосабаў узнікнення ў беларускай мове новых слоў.

*Мэта даследавання:*

•даследаваць працэс папаўнення мовы новай лексікай, выявіць шляхі ўзнікнення новай лексікі, прааналізаваць выкарыстанне новых слоў сучаснай моладдзю.

Для дасягнення гэтай мэты ставіліся і вырашаліся наступныя задачы:

1.Вызначыць групы паводле сферы ўзнікнення і выкарыстання агульнамоўных неалагізмаў.

2.Разгледзіць ступень засваення новых слоў у беларускай мове.

3.Прааналізаваць паходжанне жаргоннай лексікі.

4.Вызначыць ступень выкарыстання слэнгаў сучаснай моладдзю.

Метады даследавання**: т**эарытычныя: аналіз, сінтэз, параўнанне, абагульненне.

Аб'ектам даследавання сталі шляхі ўзнікнення новай лексікі.

*Прасачыўшы за спосабамі ўзнікнення ў беларускай мове новых слоў, мы зрабілі наступныя высновы:*

1. Спосабаў з'яўлення новых слоў некалькі:

а) прыход у мову новых слоў для абазначэння новых з'яў і для абазначэння даўно выйшаўшых з ужытку слоў;

б) запазычанні з суседскіх польскай і ўкраінскай моў, якія ўводзяцца ў мову інтэлігенцыяй. Але, на нашу думку, старыя назвы ўжо замацаваліся за гэтымі словамі, а новыя, няхай яны і беларускага паходжання, будуць толькі засмечваць лексіку;

в) з'яўленне ў мове неалагізмаў, аманімічных з ўжо вядомымі словамі;

г) ужыванне ў мове складанаскарочаных слоў і абрэвіятур, якія ўзнікаюць няспынна, перадаюцца на пісьме самымі рознымі часта новымі для мовы змешанымі літарна- лічбавымі абазначэннямі, што прыводзіць да не вельмі прыгожага гучання.

2. Адметнаю асаблівасцю любой высокаразвітай мовы з'яўляецца пастаяннае ўзбагачэнне новай лексікай. Па гэтым можна сведчыць, што беларуская мова знаходзіцца на высокай ступені свайго развіцця.

ЛІТАРАТУРА:

1. Адамовіч, Я. М. Беларуская мова / Я. М. Адамовіч, А. М. Клачко. – Мінск, 1992.
2. Барадулін, Р. Лісты ў Хельсінкі / Р. Барадулін. – Мінск, 2000.
3. Блінава, Э. Д. Беларуская мова / Э. Д. Блінава, Н. В. Гаўрош, М. Ц. Кавалёва. – Мінск, 2004.
4. Брыль, Я. Вячэрняе / Я. Брыль. – Мінск, 1994.
5. Каўрус, А. А. Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. – Мінск, 1987.



Репозиторий ГрГМУ

6. Лепешаў, І. Новыя словы апошніх гадоў / І. Лепешаў // Роднае слова. – 1992. – № 2. – С. 82–84.
7. Танк, М. Дзённікі / М. Танк. – Мінск, 1994.
8. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск, 1988.
9. Слоўнік іншамоўных слоў. – М. : Ліст, 1998.
10. Сусветная энцыклапедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.be.wikipedia.org. – Дата доступу : 10.01.2013.
11. Рамук, Вітаўт. Пара словаў / Вітаўт Румак // Наша Ніва. – № 13. – 2005. – С. 11.
12. Бераснёў, П. Эх, Смаленск! / П. Бераснёў // Звязда. – № 22. – 2007. – С. 33.

## РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ЖАНРАЎ ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія»
**Усава Н.М., студэнтка 2 курса эканамічнага факультэта**
Кафедра лінгвістычных дысцыплін
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Скікевіч Т.І.

Ведаць сваю нацыянальную культуру, народную творчасць, родную мову – гэта значыць ведаць вытокі сваёй айчыны, свайго народа. Народ, які не ведае і не хоча ведаць свайго мінулага, ніколі не будзе мець будучыні.

Вядомы беларускі першадрукар, асветнік і гуманіст Францішак Скарына пісаў: «Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, – так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць».

Лепшыя ўзоры вуснай паэзіі розных жанраў актыўна жывуць і зараз, уключаюцца ў рэпертуар калектываў мастацкай самадзейнасці. Старыя фальклорныя творы сёння атрымліваюць новае жыццё ў выкананні вядомых вакальна-інструментальных ансамбляў. На нашай зямлі народ песенны, творчы. Шмат песень, легенд, казак ведаюць нашы старажылы. У асноўным, гэта песні пра каханне. Яны вельмі разнастайныя па ідэйна-мастацкім змесце, матывы іх невычэрпныя.

Папулярным народным жанрам заўсёды былі прыпеўкі. Гэта невялікія песенькі на самыя розныя тэмы. Часта яны выконваюцца падчас танцаў. Прыпеўка – адзін з відаў славесна-музычнай народнай творчасці. Як і ў любым лірычным творы, думкі і пачуцці, якія выяўляюцца ў прыпеўках, не маюць працягласці ў часе. «Частушка, – пісаў вядомы збіральнік твораў гэтага жанру В. І. Сімакоў, – выказвае адзін момант, адно мімалётнае перажыванне чалавека ў дадзеную хвіліну». Вельмі папулярныя прыпеўкі і сёння. У нашай мясцовасці

Рэпазіторый ГрГМУ